

# КРЫНІЧКА

**Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Чэрнікаўшчынскі вучэбна-педагагічны комплекс
дзіцячы сад – базавая школа”**

Выпуск №7 (15)
Май 2021

## У нумары:

**Віншуем пераможцаў!** **Стар. 1**

**Абласная грамадзянска-патрыятычная акцыя “Быць годнымі Вялікай Перамогі!”** **Стар. 2**

**Урачысты мітынг памяці** **Стар. 3**

**Экскурсія на гісторыка-культурны комплекс “Лінія Сталіна”** **Стар. 4**

**Урачыстая лінейка, прысвечаная святу “Апошні званок”** **Стар. 5**

**Школьны турыстычны злёт** **Стар. 6**

## Віншуем пераможцаў!



Віншуем Казарана Канстанціна, вучня 6 класа, і настаўніка інфарматыкі Баркоўскую Г.І. з перамогай у раённай дыягнастычнай алімпіядзе па інфарматыцы (**дыплом I ступені**).

Жадаем не спыняцца на дасягнутым, заўсёды рухацца наперад і дасягаць самых высокіх вяршынь!!!

# Абласная грамадзянска-патрыятычная акцыя
# “Быць годнымі Вялікай Перамогі!”

3 мая адбылося адкрыццё абласной акцыі "Быць годнымі Вялікай Перамогі!".

Дадзеная акцыя - гэта выказванне павагі тым, дзякуючы каму мы жывыя. Наша задача сёння - захаванне гістарычнай памяці аб подзвігу і гераізме народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, аб воінскім і працоўным подзвігу нашых продкаў праз асабістае асэнсаванне, традыцыі і лёсы сем'яў, якія захоўваюць светлую памяць пра сваіх блізкіх, праз разуменне ролі нашай краіны ў барацьбе супраць фашызму .





4 мая для навучэнцаў 5-9 класаў прайшла адзіная інфармацыйная гадзіна. Вучні з гонарам расказвалі пра сваіх сваякоў, якія былі непасрэднымі ўдзельнікамі ці сведкамі тых ужо далёкіх страшных ваенных гадоў, рабілі калажы "Дзякуй за мірнае неба!", "Кошт Вялікай Перамогі".

Вучні пачатковай школы прынялі актыўны ўдзел у выставе малюнкаў "Памяць пра вайну вачыма дзяцей".





5 мая ў школьнай бібліятэцы была арганізавана тэматычная выстава “Вялікая Перамога”. Вучні азнаёміліся з творамі ваеннай тэматыкі, прынялі ўдзел у конкурсе чытальнікаў вершаў, прысвечаных Вялікай Айчыннай вайне.






6 мая ў рамках абласной грамадзянска-патрыятычнай акцыіі “Быць годнымі Вялікай Перамогі!” для вучняў 5-9 класаў прайшоў урок мужнасці “Летапіс Вялікай Перамогі”.





# Урачысты мітынг памяці

7 мая ў рамках абласной грамадзянска-патрыятычнай акцыі "Быць годнымі Вялікай Перамогі!" адбыўся ўрачысты мітынг памяці каля помніка воінам-землякам, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.






Таксама ў гэты дзень шэрагі ГА БРПА папоўніліся новымі членамі: у акцябраты былі прыняты вучні 1 класа, а піянерамі сталі чацвёртакласнікі: Гурло Вячаслаў, Далжук Дар'я, Кулікоўская Дар'я і Нечпай Сяргей.










Вучнямі 9 класа сумесна з дырэктарам школы Крываротам А.С. і класным кіраўніком Баркоўскай Г.І. была пасаджана памятная алея туй.






# Экскурсія на гісторыка-культурны комплекс “Лінія Сталіна”




26 мая вучні 5-9 класаў наведалі гісторыка-культурны комплекс "Лінія Сталіна".

"Лінія Сталіна" - адзін з найбольш грандыёзных фартыфікацыйных ансамбляў на тэрыторыі Беларусі. Ён быў створаны да 60-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Комплекс ствараўся метадам народнай будоўлі, у якой прымалі ўдзел дзяржаўныя і грамадскія арганізацыі, прадпрыемствы розных формаў уласнасці, энтузіясты. Асноўны цяжар працы па стварэнні музея лёг на плечы падраздзяленняў інжынерных войскаў Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

Комплекс быў адкрыты для наведвання 30 чэрвеня 2005 года. Ён закліканы не толькі ўвекавечыць грандыёзную сістэму абарончых умацаванняў раёнаў "Лінія Сталіна", але і стаць сімвалам гераічнай барацьбы савецкага народа супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.













# Урачыстая лінейка, прысвечаная святу “Апошні званок”

29 мая адбылася ўрачыстая лінейка, прысвечаная святу “Апошні званок”. На мерапрыемстве прысутнічалі ганаровыя госці: Макарэвіч В.А., дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі “Сацыяльна-педагагічны цэнтр Дзяржынскага раёна”; Епіфанаў І.А., намеснік дырэктара філіяла “Фалько-Агра” па агранаміі; Сенькевіч І.В., старшыня прафкама філіяла “Фалько-Агра”.

Школьны званок у апошні раз празвінеў для вучняў 9 класа: Маглены Максіма, Маісеенка Таццяны, Самца Міхаіла, Саўчук Аліны і Халеева Дзмітрыя. Жадаем вучням 9 класа здаць выпускныя экзамены на выдатна і выбраць свой прафесійны шлях!!!
















# Школьны турыстычны злёт

31 мая для навучэнцаў школы быў арганізаваны турыстычны злёт. Хлопчыкі і дзяўчынкі змаглі праявіць свае інтэлектуальныя здольнасці ў гісторыка-краязнаўнай віктарыне, а таксама прынялі актыўны ўдзел у спартыўных спаборніцтвах.














# Аб'ява!!!




Да ўвагі бацькоў і навучэнцаў!

З 1 па 21 чэрвеня ўключна ў школе будзе працаваць школьны аздараўленчы лагер "Вясёлка" з дзённым наведваннем. Вас чакае насычаны і актыўны адпачынак, шматлікія цікавыя справы, спартыўныя мерапрыемствы і вясёлы час з сябрамі!

За падрабязнай інфармацыяй звяртайцеся да класных кіраўнікоў.

Рэдкалегія: вучні 9 класа, Баркоўская Г.І., класны кіраўнік 9 класа.
Газета выходзіць 1 раз у месяц на працягу навучальнага года.
Наступны нумар выйдзе 30 чэрвеня.